Чым жыве пасёлак газавікоў?

Як невідушчы засвоіў 15 музычных інструментаў?

СТАР. 3

Што агульнага паміж дызайнам і сякерамі?

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 СНЕЖНЯ 2013 г. СЕРАДА № 228 (27593) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАРОШЧВАННЕ ЭКСПАРТУ ЯК ПРЫЯРЫТЭТ

Аляксандр Лукашэнка 3 снежня разгледзеў кадравыя пытанні, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

АВЯР'ЯНАВА Аляксандра Казіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча;

КАРАЛЯ Аляксандра Міхайлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы;

САВІНЫХ Андрэя Уладзіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Турэцкай Рэспубліцы, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Ірак па сумяшчальніцтве;

КОЗІНЦАВА Віктара Васільевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аргенцінскай Рэспубліцы;

КУПТЭЛЯ Дзмітрыя Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспубліцы Эфіопія, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Афрыканскім саюзе, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Праграме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па навакольным асяроддзі (ЮНЕП) і Праграме Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па населеных пунктах (ААН-Хабітат) па сумяшчальніцтве;

ЕЎДАЧЭНКУ Андрэя Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Вялікім Герцагстве Люксембург па сумяшчальніцтве;

ЧУШАВА Уладзіміра Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Чарнагорыі і Рэспубліцы Македонія па сумяшчальніцтве;

ХАЙНОЎСКАГА Аляксандра Францавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Боснії і Герцагавіне па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

МІХНЕВІЧА Сяргея Іванавіча — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Гданьску (Рэспубліка Польшча);

НАЗАРУКА Ігара Васільевіча — дырэктарам дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў.

Звяртаючыся да паслоў у Польшчы і Літве, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Гэта нашы краіны-суседкі, як бы мы з імі ні жылі сёння, якія б у нас ні былі адносіны, суседзяў, мы ўжо даўно гаворым і не намі гэта прыдумана, не выбіраюць. Нам, якія б яны ні былі, трэба настройвацца на пазітыўную работу, шукаць кантакты з імі, нам трэба супрацоўнічаць. І мы так і робім, гэта наша лінія, і тое, што ў нас часам не атрымліваецца — гэта не ад нас залежыць, вельмі неадэкватныя, скажам так, да нас патрабаванні выстаўляюцца з таго боку, на якія мы пайсці не можам, сёння прынамсі, ды і не думаю, што заўтра і паслязаўтра зможам».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што вельмі важным напрамкам з'яўляецца развіццё супрацоўніцтва з Турцыяй і Іракам. Паводле яго слоў, Ірак праяўляе вялікі інтарэс да Беларусі, паступаюць розныя прапановы і ад бізнесменаў, і ад палітыкаў. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў хуткім часе пачнецца аднаўленне гэтай краіны, а таму неабходна скарыстацца выпадкам і прапанаваць Іраку вялікую наменклатуру беларускіх тавараў.

Звяртаючыся да Андрэя Савіных, які ўзначаліць беларускую дыпмісію ў Турцыі і Іраку па сумяшчальніцтве, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Ірак «не павінен быць у дадатак да работы ў Турцыі», на гэтым напрамку неабходна больш актыўна разгортвацца, і не толькі паслу, але і членам урада, кіраўнікам прадпрыемстваў.

Што датычыцца Турцыі, то, на думку Прэзідэнта, большай дынамікі патрабуюць гандлёва-эканамічныя адносіны.

Прэзідэнт падкрэсліў важнасць для Беларусі такога напрамку, як супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі.

«Палітыка палітыкай, але гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, экспарт з'яўляецца прыярытэтам нашай знешнеэканамічнай дзейнасці, і ад гэтага нікуды не дзенешся, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Геапалітыка нам не патрэбна, мы не збіраемся гуляць у гэтыя гульні, у якія гуляюць 7-8 вядомых дзяржаў. Нам гэта абсалютна не трэба. Нам палітыка патрэбна для таго, каб прадставіць краіну, абараніць яе інтарэсы, усё астатняе — гэта гандаль, экспарт. Гэта задача нумар адзін».

НАВАГОДНІЯ АРХІТЭКТАРЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Мінску пачаўся мантаж галоўнай навагодняй ёлкі — на Кастрычніцкай плошчы.

На трывалыя металічныя канструкцыі будуць нанізаны пышныя зялёныя лапіны са штучнай ігліцы. У гэтым сезоне ўбор гэтай яліны змянілі: ад выкарыстання традыцыйных шароў адмовіліся. Яе ўпрыгожаць рознымі дэкаратыўнымі элементамі, цацкамі, навагодняй ілюмінацыяй. На ёлцы будзе красавацца і сімволіка сусветнага першынства па хакеі 2014 года. Усталяванне канструкцыі і ўпрыгожванне галоўнай сталічнай ёлкі вядзецца слесарамі механа-зборачных работ прадпрыемства «Мінскрэклама».

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:

«Аграэкатурызм з'яўляецца адным з найбольш перспектыўных кірункаў развіцця турызму ў Гродзенскай вобласці. У рэгіёне нямала робіцца для развіцця турызму, хоць яшчэ застаецца вялікі патэнцыял. Мы гатовы падтрымліваць разнастайныя праекты ў гэтай сферы. Але менавіта аграэкатурызм сёння карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў параўнанні з іншымі відамі адпачынку. З улікам прыроднай прыгажосці гродзенскага краю, з'яўлення тэрыторый з ільготным рэжымам для вядзення бізнесу праца ў гэтым кірунку бачыцца вельмі перспектыўнай».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.12.2013 г.

Долар ЗША	9380,00	▲
Еўра	12710,00	▼
Рас. руб.	282,00	■
Укр. грыўня	1141,12	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 2°
Віцебск	+ 1°
Гомель	+ 1°
Гродна	+ 1°
Магілёў	0°
Мінск	+ 1°

Аляксандр БОЙКА:

«ПЕДАГОГАЎ СЛУХАЮЦЬ. АЛЕ ЦІ ЧУЮЦЬ?»

Што патрэбна для таго, каб адукацыйная галіна развівалася? Каб у педагогіку прыходзілі лепшыя і моладзь не імкнулася збегчы на больш высокааплатную работу пры першай жа магчымасці? Гэта пытанне рэфрэнам гучала ва ўсіх выступленнях удзельнікаў Пленуму ЦК Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі. Ні для каго не сакрэт, што на педагагічных спецыяльнасцях у ВНУ ужо не першы год фіксуюцца недаборы. А многія з залічаных на першы курс не ў стане асіліць нават першую экзаменацыйную сесію. Педагагічныя калектывы імкліва старэюць. Паўсюдна не хапае настаўнікаў фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, хіміі...

УМЕЦЬ УБАЧЫЦЬ ПРАБЛЕМУ

— Паказальная тэндэнцыя. Калі раней прафсаюз звяртаўся да органаў дзяржаўнага кіравання па адным ці некалькіх лёсавызначальных пытаннях, то сёння колькасць гэтых пытанняў рэзка ўзрасла. А ўсё таму, што нашы пытанні перакідваюцца паміж узроўнямі ўлады, асобныя кіраўнікі не жадаюць браць адказнасць на сябе, а нярэдка проста няздольныя не толькі знайсці рашэнне, але і ўбачыць праблему, — не стаў хавацца за дыпламатычнай рыторыкай старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.

СТАР. 5

ГНУТКАЯ ЗАНЯТАСЦЬ:

як абараніць работнікаў і засцерагчы ад небяспекі працадаўцаў?

Сучасны рынак працы ва ўсім свеце ўсё больш імкнецца да выкарыстання гнуткіх формаў занятасці. У Беларусі ж гэты патэнцыял пакуль яшчэ выкарыстоўваецца недастаткова. Чаму? Беларускія і замежныя эксперты выказалі свае аргументы на пасяджэнні «круглага стала» «Гнуткія формы занятасці: за і супраць», арганізатарамі якога выступілі «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын» і «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва».

Дарэчы, да гэтага часу няма дакладнага азначэння паняцця «гнуткая занятасць». Таму выкарыстоўваецца падыход ад зваротнага — усё, што не з'яўляецца стандартнай або традыцыйнай (устойлівай) занятасцю, лічыцца гнуткай або атыповай занятасцю. Гнуткія формы занятасці адрозніваюцца ад традыцыйных працягласцю дагавора, рэжымам працоўнага часу, месцам выканання работы, зместам абавязацельстваў паміж работнікам і працадаўцам.

Чаму ж, нягледзячы на тое, што гнуткія формы занятасці могуць даць большую свабоду дзеянняў і дазваляюць спалучаць працу з вучобай, выхаваннем дзяцей, нягледзячы на Дырэктыву № 4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь» і падрыхтаваныя Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны рэкамендацыі па ўжыванні гнуткіх формаў занятасці, да іх да гэтага часу ставяцца з пэўнай доляй асцярогі і работнікі, і працадаўцы?

«ЗА» ГНУТКУЮ ЗАНЯТАСЦЬ

Дырэктар Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана ШАЎЧЭНКА выступае ў падтрымку гнуткіх формаў занятасці. Яна ўказвае на наступную іх перавагу: «Працадаўцы атрымліваюць магчымасць кіраваць колькасцю і складам работнікаў, зыходзячы з кан'юнктуры рынку, аптымізуючы пры гэтым свае выдаткі і падтрымліваючы належны ўзровень прадукцыйнасці працы», — і адзначае, што асаблівае значэнне гнуткія формы занятасці маюць для развіцця малога бізнесу. У той жа час работнікі, па словах дырэктара НДІ працы, атрымліваюць магчымасць спалучаць працу з індывідуальнымі патрэбамі, абумоўленымі станам здароўя, сямейнымі абавязкамі, жаданнем атрымаць адукацыю, набыць вопыт працы і г.д.

СТАР. 2

■ Стыхія

ВЕЦЕР ПЕРАКУЛІЎ ЛОДКУ З РЫБАКОМ

Ад моцнага ветру, парывы якога дасягалі 24 метраў за секунду, у панядзелак пацярпелі 11 населеных пунктаў у сямі раёнах Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях. Былі пашкоджаны дахі двух жылых дамоў, трох вытворчых і 13 сельскагаспадарчых будынкаў. Паводле інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пацярпелых не было.

Бліжэй да паўдня ў Бабруйску ўтварылася пагроза абрыву кантактнай сеткі тралейбуснай лініі рэкламнымі шчытамі, пашкодженымі парывамі ветру. Работнікі МНС дэманціравалі канструкцыі шчытоў. На гэты час участак дарогі перакрылі, рух вёўся па аб'язных шляхах. Працу двух тралейбусных маршрутаў аднавілі ў 16.40.

У Бабруйску на Бярэзіне прыкладна ў гэты ж самы час перад абедам парывам ветру перакуліла гумавую лодку рыбака. Ён апынуўся ў вадзе, здолеў даплыць да вострава. А вось пераадолець 800 метраў да берага не змог, таму патэлефанаваў выратавальнікам. Тыя на лодцы даставілі 35-гадовага мужчыну на бераг, адкуль яго шпіталізавалі медыкі з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:

«НІЯКІХ ПЕРАНОСАЎ ТЭРМІНАЎ МАДЭРНІЗАЦЫІ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ»

Усе пытанні па мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны павінны быць завершаны ва ўстаноўленыя тэрміны. Гэтага запатрабаваў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, у ходзе якога разглядалася пытанне аб выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы абавязкова павінны завяршыць ва ўстаноўленыя Прэзідэнтам тэрміны ўсе аб'екты ў бягучым годзе і ў першым паўгоддзі наступнага года, — адзначыў кіраўнік урада. — Гэта не падлягае абмеркаванню». Па шэрагу аб'ектаў ужо неаднаразова пераносіліся тэрміны ўводу ў эксплуатацыю, за кошт чаго павялічыўся іх кошт, а таксама ўзнікаюць розныя пытанні па рэалізацыі гэтых праектаў. «Вы ведаеце, што за гэтыя і іншыя недахопы шэраг кіраўнікоў вызвалены ад займаемых пасад, заведзены крымінальныя справы, — нагадаў Міхаіл Мясніковіч. — У гэтым плане рашэнні, якія мы будзем прымаць, павінны быць накіраваны на тое, каб выправіць сітуацыю ў галіне».

Дрэваапрацоўчая галіна мае для Беларусі вялікае значэнне. Гэта, паводле слоў прэм'ера, тая ніша эканомікі, якую краіна абавязана заняць. Для гэтага ў рэспубліцы ёсць галоўнае — поўны тэхналагічны цыкл і сыравінная зона.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФІНАНСАВЫЯ ЎЛАДЫ ЕЎРОПЫ ПАГРАЖАЮЦЬ САНКЦЫЯМІ ВЯДУЧЫМ РЭЙТЫНГАВЫМ АГЕНЦТВАМ

Еўрапейскае ўпраўленне па каштоўных паперах і рынках (ESMA) можа прымяніць санкцыі ў дачыненні да найбуйнейшых рэйтынгавых агенцтваў Fitch Ratings, Moody's Investors Service і Standard & Poor's за парушэнне стандартаў у працэсе перагляду суверэнных рэйтынгаў, перадаюць інфармагенцтвы. ESMA правяла даследаванні дзейнасці і практыкі рэйтынгавых агенцтваў у перыяд з лютага па кастрычнік 2013 года. Як паведамляецца ў справаздачы ўпраўлення, парушэнні ў працы рэйтынгавых агенцтваў былі выяўлены ў такіх пытаннях, як незалежнасць ацэнкі, канфідэнцыяльнасць, а таксама тэрміны публікацыі паведамленняў. ESMA зловіла агенцтвы на прадастаўленні інфармацыі аб змяненні суверэнных крэдытных рэйтынгаў трэцім бакам да іх афіцыйнай публікацыі. Санкцыі могуць прадугледжваць штраф або пазбаўленне ліцэнзіі. Сёння «вялікая тройка» — Standard and Poor's, Moody's і Fitch — кантралюе каля 95% рынку рэйтынгаў.

ПЯЦЬ ДЗЯРЖАЎ УСХОДНЯЙ АФРЫКІ ДАМОВІЛІСЯ ЎВЕСЦІ АДЗІНУЮ ВАЛЮТУ

Пяць дзяржаў усходнеафрыканскай супольнасці (УАС) — Кенія, Уганда, Танзанія, Руанда і Бурундзі — падпісалі пагадненне аб увядзенні адзінай валюты, перадаюць інфармагенцтвы. Адпаведны пратакол быў падпісаны ў сталіцы Уганды Кампале. Кіраўнікі пяці дзяржаў, якія ўваходзяць у УАС, дамовіліся аб стварэнні адзіных інстытутаў, уключаючы Цэнтрабанк. Гэтыя меры павінны пазбавіць супольнасць ад выдаткаў на абмен валют і тым самым панізіць кошт транзакцый. Прэзідэнт Кеніі і старшыня суполкі Ухуру Кеніята адзначыў, што з увядзеннем адзінай валюты бізнесу стане прасцей гандляваць, а ў замежных інвестараў з'явіцца дадатковы стымул укладваць грошы ў рэгіён. Чакаецца, што ўвядзенне адзінай валюты будзе рэалізавана на працягу 10 гадоў.

УЕЗД У АЛМАТЫ ЗРОБЯЦЬ ПЛАТНЫМ

За ўезд у Алматы будуць спаганяць плату. Пра гэта, як перадае агенцтва «Навіны-Казахстан», паведаміў акім (кіраўнік адміністрацыі) горада Ахметжан Ясімаў. Аб мерах, накіраваных на барацьбу з аўтамабільнымі заторамі, ён распавёў на 1-м Алмацінскім інвестыцыйным форуме. Паводле слоў чыноўніка, у горадзе таксама арганізуюць платныя дарогі, а ўжо з наступнага года з'явіцца платныя паркоўкі. Калі менавіта ўсё гэта адбудзецца, чыноўнік не ўдакладніў. Ясімаў адзначыў, што прапанаваны ўладамі праект «будзе не зусім станоўча ўсімі ўспрыняты», падкрэсліўшы, аднак, што ён знізіць колькасць транспарту, які ўязджае ў горад, на 30 працэнтаў.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 13228

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КРЫМСКІ ПАРЛАМЕНТ ПРАПАНУЕ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ДАЛУЧЭННЯ УКРАІНЫ ДА МЫТНАГА САЮЗА

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Крыма прапанаваў прэзідэнту і Кабінету міністраў Украіны ў кароткі тэрмін разгледзець пытанне аб магчымасці ўступлення Украіны ў Мытны саюз.

Адпаведнае рашэнне «Аб грамадска-палітычнай сітуацыі, якая склалася ва Украіне», прынята на пасяджэнні ў аўторак. Акрамя таго, у рашэнні змешчана просьба да міністра адукацыі і навукі Украіны Дзмітрыя Табачніка «прыняць неадкладныя меры па недапушчэнні зрыву навучальнага працэсу ў вышэйшых навучальных установах Украіны, выкарыстання іх кіраўнікамі свайго службовага становішча для прызыву моладзі да ўдзелу ў вулічных акцыях».

КОРАТКА

У Беларусі ўжо зарэгістравана 16 гаражных СТА. Усе аб'екты размешчаны на тэрыторыі Дзяржынскага і Маладзечанскага раёнаў.

Цэнтр Мінска ўваходзіць у трыццатку самых дарагіх офісных кварталаў свету. Самыя высокія арэндныя стаўкі на офісныя плошчы Мінска — у раёне вуліц Кірава, Талстога, Кл. Цэткін, Нямігі, Зыбіцкай і Я.Купалы. Месячныя арэндныя стаўкі там складаюць 35-43 еўра за 1 кв.м.

Домік Дзеда Мароза будзе прымаць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 11 гадоў у Цэнтральным дзіцячым парку імя М.Горкага ў Мінску штодзень з 21 снежня па 7 студзеня з 10.00 да 18.00. Толькі 1 студзеня прыём пачнецца з 12.00, а 7 студзеня наведаць яго можна будзе да 16.00. Наведванне абыдзецца ў суму ад Br75 тыс. да Br200 тыс.

Цэны на другаснае жыллё ў Мінску да канца года могуць знізіцца яшчэ прыкладна на 3%. Сёння розніца паміж коштам прапановы і коштам здзелкі на другасным рынку Мінска ў сярэднім складае 10%.

18470 чалавек прыцягнуты ў студзені-верасні гэтага года да адміністрацыйнай адказнасці за безбілетны праезд у цягніках і 3673 — за курэнне ў неўстаноўленых месцах у выніку праверак у цягніках. У выніку спагнана Br1,411 млрд.

ЯК ВЫ ЎЗДЫМАЕЦЕ САБЕ НАСТРОЙ?

Алесь МАЛЧАНАЎ, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Мінск:

— У мяне ёсць некалькі спосабаў. У «веснулета-восень» вельмі дапамагае веласіпед і добрая музыка. Раніцай звычайна ўздымае настрой радыё «Сталіца». Калі гэта не дапамагае, то набываю квіток куды-небудзь і еду (з веласіпедам)! Лазня добра пазбаўляе ад песімістычных думак, таксама шакалад.

Галіна СУША, спецыяліст па традыцыйных промыслах і рамёствах у Інстытуце культуры Беларусі, Мінск:

— Калі наконт таго, як я ўздымаю сабе настрой, то тут усё проста: я — аптымістка, і настрой у мяне зазвычай «на ўздыме». Калі ёсць цікавая праца, то і настрой выдатны. Я член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Зараз пішу для нашага часопіса «Веснік Інстытута культуры Беларусі» артыкул пра народнага майстра Ларысу Лось...

Алесь АРКУШ, паэт, Полацк:

— Я даўні аматар вінілу. І таму для мяне найлепшы спосаб узняць настрой — занурыцца ў сваю калекцыю, выбраць штосьці адпаведнае і паслухаць. А ўвогуле лепшы «ўздымальнік» майго настрою — гэта сябар, пісьменнік Вінцэсь Мудроў. З ім дакладна не засумуеш!

Ларыса ЦІМОШЫК.